вернісаж

# Ад летапісу да аб'ектыва камеры

**Кніжная выстаўка пад назвай «Гарадскія матывы» працуе ў кальцавой галерэі на 2 паверсе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.**

Нагадаем, што сёлета Мінск святкуе 955-годдзе ад першай згадкі пра яго ў «Аповесці мінулых часоў». Праз сваё зручнае геаграфічнае месцазнаходжанне на перасячэнні шляхоў з Захаду на Усход, праз гандлёвыя зносіны, якія спрыялі эканамічнаму росквіту, Мінск (а калісьці Менск, паводле летапісных запісаў) заўжды аднаўляўся, паўставаў з попелу пасля шматлікіх войнаў і пажараў, што пракаціліся па нашай зямлі. Цяпер Мінск — адзін з найстаражытнейшых гарадоў Еўропы — сталіца незалежнай дзяржавы.

Святочная выстаўка пачынаецца з раздзела «Сведкі далёкай мінуўшчыны». Тут экспануюцца выданні з фондаў галоўнай кніжніцы краіны, на старонках якіх апісваюцца даўнія падзеі з гісторыі горада, а таксама тыя, што дэманструюць разнастайнасць гістарычных крыніц. Прадстаўлены зборнікі дакументаў, сабраных даследчыкам Мінска, гісторыкам, археографам і краязнаўцам Аляксеем Сапуновым. Адно з найкаштоўнейшых выданняў, якое можна пабачыць у экспазіцыі, — «Збор старажытных грамат і актаў гарадоў Мінскай губерні, праваслаўных манастыроў, цэркваў і па розных прадметах». Пабачыла кніга свет у 1848 годзе, а трохі пазней мінскі гарадскі галава Караль Чапскі (займаў гэтую пасаду ў 1890—1901 гг.) пакінуў пад вокладкай свой экслібрыс.

Вартая ўвагі і выдадзеная ў 1952 годзе кніга Міхаіла Асмалоўскага «Мінск», дзе адлюстравалася першая спроба абагульніць горадабудаўнічы досвед сталіцы, паказаць яе гісторыю і асаблівасці развіцця пачатку 1950-х гадоў.

Паўнавартаснае ўяўленне пра Мінск і разнастайнасць яго архітэктуры даюць арыгінальныя паштоўкі канца XIX — пачатку XX стагоддзя з гарадскімі забудовамі, храмамі, плошчамі, будынкамі тэатраў, вакзалаў, маляўнічымі выявамі вуліц і наваколля, святочнай і будзённай рэчаіснасці.

Разынкай раздзела выстаўкі «Прагулка па галоўнай вуліцы» з'яўляецца выданне пад назвай «Галоўная вуліца Мінска», пад вокладкай якога адлюстраваны гісторыі соцень дамоў праспекта Незалежнасці, вуліцы, што мяняла назву каля дзясятка разоў на працягу свайго існавання. Можна знайсці тут і звесткі пра людзей, якія жылі на галоўнай вуліцы. Выданне ўтрымлівае ўнікальныя здымкі, планы і архіўныя дакументы.




Трэці раздзел часовай экспазіцыі называецца «Горад і людзі ў аб'ектыве фотакамер» — тут прадстаўлены юбілейныя, навукова-папулярныя выданні, багата ілюстраваныя альбомы.

Выстаўка чакае наведвальнікаў да 2 кастрычніка.

**Мая РЫСЬ**